на наш взгляд, играют незаменимую роль в углублении межкультурных коммуникаций молодежи.

*1.* Выставка китайского нематериального наследия в Гонконге [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www. hong-kong.ru/news/vystavka-nematerialnogo-kulturnogo-nasledija-kita. – Дата доступа: 26.12.2018.

*2.* Выставка китайского нематериального наследия в Минске [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://russian. news.cn/2017-06/20/c_136378492.htm. – Дата доступа: 21.12.2018.

*3.* Закон Китайской Народной Республики о нематериальном культурном наследии [Электронный ресурс] – Режим доступа: https://asia-buisiness.ru/law3/cultural/. – Дата доступа: 26.03.2019.

*4.* Охрана культурных памятников в Китае [Электронный ресурс] // Краткие сведения о Китае. – Пекин : Синьсин. – Режим доступа: http://www.iatp.am/hayknet/knr-pam.htm/. – Дата доступа: 7.08.2019.

*5.* Список объектов Всемирного наследия ЮНЕСКО в Китае [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://russian/people.com.cn/31517/7210429.htm. – Дата доступа: 18.12.2018.

# ЗАХАВАННЕ ГАНЧАРНАГА РАМЯСТВА ў другой палове XX ст.

***Т. І. Васюк,*** *дацэнт,*

*дацэнт кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Імклівае XX ст. было адзначана цікавымі падзеямі ў развіцці беларускай керамікі і ганчарства ў пасляваенны перыяд. У архівах захаваліся здымкі гарадоў і мястэчак Беларусі 50–60-х гг., дзе на кірмашах дамініравала кераміка. «Па горшкі» – гэта пазыўныя словы ганчароў, якія развозілі па вёсках гаршкі і іншую кераміку, якую часам мянялі на зерне і іншыя прадукты харчавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Затым калгасы пачалі пераўтварацца ў саўгасы, індустрыялізацыя рушыла ў гарады, ганчароў-аднаасобнікаў збіралі ў арцелі з вельмі высокімі нормамі выпуску прадукцыі. Пры гэтым мастацкая і тэхнічная якасць керамікі пагаршалася. Такія працэсы адбываліся паўсюдна ў нашай краіне: у Івянцы, Рэчыцы, Радашковічах, Барысаве, Гарадку, Поразаве, Дуброўне і іншых мясцінах.

У вёсцы Грабаўка Гомельскай вобласці аб’ядналася цагельня і ганчарня, у выніку да 1970-х гг. працавала цагельня на дравяных печах. З цэглы аднаўлялі знішчанае вайной жыллё, у якім была вялікая патрэба. Таму ў канцы 1970-х гг. узнікае прадпрыемства «Керамін» з задачамі і планамі па вырабу архітэктурнай керамікі. На сённяшні дзень «Керамін» вырабляе на высокім тэхналагічным узроўні санітарную архітэктурную кераміку з кампазітных матэрыялаў. На прыроднай чырвонай гліне працуюць Івянецкая фабрыка мастацкай керамікі, Барысаўскі камбінат прыкладнога мастацтва імя Аляксандра Кіщанкі і Радашковіцкая фабрыка мастацкай керамікі.

Дзейнасць Радашковіцкай фабрыкі мастацкай керамікі, якая існуе ў сённяшні час, адносіцца да мясцовай вытворчасці і паспяхова задавальняе патрэбы насельніцтва ў кераміцы бытавога значэння.

Неабходнасць у архітэктурнай кераміцы пачаў здавальняць створаны ў 1967 г. «Керамін», які дасканала вырабляе будаўнічую керамічную плітку з традыцыйных і новых кампазітных матэрыялаў.

У 1979 г. увайшоў у рух Добрушскі фарфоравы завод, які меў усесаюзнае размеркаванне вытворчага асартыменту сталовага посуду. Дадзенае прадпрыемства паспяхова існуе і ў XXI ст. Адзначым, што Мінскі фарфоравы завод з асноўнай групай чайнага і сталовага асартыменту ў канцы XX ст. спыніў сваё існаванне.

У традыцыйнай кераміцы 70–80 гг. XX ст. адбыліся цікавыя трансфармацыі. Асартымент ганчарных вырабаў стаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

менш запатрабаваным на пэўны перыяд, і існавала толькі сувенірная прадукцыя. Але кераміка ёсць вечнае рамяство рук чалавека і агню, якое ніколі не згасне.

Такім чынам, у канцы 1970-х гг. у Беларусі сфарміраваліся асноўныя напрамкі развіцця керамікі: архітэктурнай, мастацкай, традыцыйнай.

Традыцыйная кераміка была падпарадкавана «міністэрству» мясцовай вытворчасці. Жаданне захаваць традыцыі ў складаным працэсе керамічнай вытворчасці не заўсёды мелі вялікі плён. Знікала павага да майстроў-адзіночак, да іх кустарнай вытворчасці, многія пакінулі сваю справу. У вёсцы Гарадная Столінскага раёна Брэсцкай вобласці сяляне толькі зімой займаліся ганчарным рамяством, а многія з іх зусім пакінулі гэты занятак, бо больш значныя заробкі можна было мець на іншай вытворчасці. Але заставаліся адзінкі, як Антон Такарэўскі, патомны ганчар з Пружан, які склаў гонар беларускай прыроднай гліне і ўвайшоў з чорназадымленай глянцаванай керамікай ва ўсе энцыклапедыі XX ст. Ён рабіў ужо не функцыянальны посуд дзеля пэўнага прызначэння, узнікла самая значная роля – эстэтычная. Недарэмна палескую кераміку параўноўваюць з грэчаскай па дасканаласці формы, якая адпавядала законам залатога сячэння.

Таксама на высокім узроўні працавалі патомныя ганчары мястэчка Івянец (імёны многіх з іх занесены ў энцыклапедыю XX ст.). У 70-я гг. мінулага стагоддзя ганчары працавалі на фабрыцы, але кожны з іх меў свой індывідуальны стыль, густ і манеру выканання. Майстры пакінулі земляныя горны, дзе выраблялі цудоўную кафлю і шырокі асартымент посуду. Газавыя і электрапечы не адпавядалі якаснаму спяканню чарапка з прыроднай гліны, аб гэтым ведалі і казалі ў слых Кулікоўскі, Звярко, Маўчановіч, Сасноўскі і іншыя майстры, таму ўзнікалі супярэчлівыя адносіны з кіраўніцтвам фабрыкі. Так у Івянцы з простай «хвэлькі» нарадзілася фірмовая



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фляндроўка як паясны від дэкору гліняных вырабаў у «сырым» стане. Гэта нібыта рытмы дэкору, узятыя з тканых ручнікоў.

У 1970-я гг. адбываецца працэс вытяснення з побыту традыцыйнай керамікі. Узнікаюць металічныя і пластмасавыя ёмкасці, якія ў нечым больш зручныя і даўгавечныя. Гліняныя вырабы набываюць асаблівы кошт і значэнне. Ганчарства становіцца ручной дробнасерыйнай вытворчасцю. Такі працэс уздзеяння індустрыялізацыі паскорыў фарміраванне мастацкай керамікі, маюцца на ўвазе штучныя вырабы. Шырока за межы краіны трапляла дробная сувенірная пластыка Сямёна Саўрыцкага з Лагойска, Лявона Панамарэнкі з Мінска, Мікалая Пушкара з Мазыра і іншых майстроў з розных рэгіёнаў Беларусі.

## РЕПРЕЗЕНТАЦИЯ МУЗЫКАЛЬНОГО ФОЛЬКЛОРА В ПРОСТРАНСТВЕ БЕЛОРУССКОЙ АНИМАЦИИ

***Н. И. Влазнюк,***
*магистр педагогических наук,*
*старший преподаватель кафедры русского языка как иностранного*
*Белорусского государственного университета культуры и искусств*

Музыкальный фольклор, включающий в себя вокальное, инструментальное, вокально-инструментальное и музыкально-танцевальное народное творчество, в широком толковании представляет собой «ветвь (или корень) единой музыкальной культуры» [3].

Разнообразное воплощение музыкальный фольклор находит в образно-художественном пространстве белорусского аниматографа. «Благодатной почвой» для претворения народно-музыкальной сферы искусствовед А. Карпилова считает анимационные народные сказки [2, с. 373]. Волшебные инструменты, звукам которых повинуются представите-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ